Мілы Дружа!

Запрашаем цябе ў чароўнае падарожжа па старонках нашага зборніка.

Ты маеш магчымасць апынуцца ў самых незвычайных і казачных гісторыях твайго жыцця, знайсці шмат новых сяброў, прагуляцца па зачараваным лесе, перажыць неверагодныя прыгоды і пачуцці. Апынуцца пад чарамі феяў, залезці на велізарныя дубы, зразумець дзе зло, а дзе дабрыня.

Навучыцца быць добрым, вясёлым, ветлівым і жыццярадасным.

Пазнаёміцца з прыгажосцю і мілагучнасцю беларускай мовы, знайсці свет новых ведаў, даць волю сваім творчым талентам размалёўваючы малюнкі!

Ты трымаеш у руках невялічкі альманах, у якім сабрана семнаццаць лепшых казак.

Чытай і ўсміхайся!

з пяшчотай і дабрынёй
арганізатары конкурсу "Зачаруй казкай"
Аксана Іванюк і Аляксандра Літвінчук

Менск, 2010

Шчыра дзякуем:

Удзельнікам конкурсу;

Сябрам справядлівага журы:

Алегу Хаменка
Васілю Дранько-Майсюку
Валярыне Куставай;

Карэктару Святлане Тоўсцік;

Дызайнеру Паліне Літвінчук;

Дзякуючы ім дзеці маюць казку!



*Ганчарова Кацярына*
*Казка пра дзяўчынку-зорачку*

Высока ў небе жыла маленькая Зорачка. Кожную ноч, калі неба станавілася цёмным і ў вокнах дамоў загараліся лямпы, яна глядзела на зямлю, бачыла, як мамы ўкладваюць спаць сваіх дзетак.

Папраўляюць ім коўдру. Гладзяць па шчочцы, расказваюць казку і выключаюць у пакоі святло.

Дзеткі засынаюць, і тут… пачынала адбывацца самае цікавае. Дзеткі спалі і… усміхаліся ў сне!

Зорачка уважліва ўглядалася ў іх расчырванелыя тварыкі (зорачкі могуць бачыць праз дах!), спрабавала зразумець, што яны бачаць у сваіх снах, чаму ўсміхаюцца. “Ах,- думала Зорачка, як бы даведацца, як бы пабачыць тое, што бачаць дзеткі, чаму усміхаюцца так счастліва і задаволена.

Аднойчы Зорачка сустрэла нябесную Чараўніцу.

- Дабранач, Зорачка! – сказала ей Чараўніца.- Сёння цудоўная ноч! Я магу выканаць любое тваё жаданне, толькі скажы, чаго табе хочацца больш за ўсё?
- О! - усклікнула ўсхваляваная Зорачка, - у мяне ёсць адно вельмі вялікае жаданне. Я хачу даведацца, чаму дзеткі ўсміхаюцца ў сне, што яны бачаць?
- Хм! Цікавае жаданне. Ніводная з мільёнаў зорак у небе не хацела пра гэта даведацца… - здзіўлена сказала Чараўніца. - Але добра, я дапамагу табе. Вось што мы зробім. Ты ператворышся ў маленькую дзяўчынку, я схаваю цябе ў жывоцік адной звычайнай жанчыны, якая жыве на зямлі і хоча мець дачку. Ты народзішся ў яе і будзеш расці, як звычайная дзяўчынка ў звычайнай сям’і. Ты сама будзеш, як і ўсе дзеткі на зямлі, бачыць сны і… усміхацца! Так ты дакладна даведаешся, што бачаць у снах маленькія дзеткі. А калі прыйдзе час, ты вернешся на неба і зноў станеш Зорачкай. Ну, як я прыдумала? Падабаецца табе мой план?”- спытала нябесная Чараўніца.

- Цудоўна! Вельмі падабаецца! Давай хутчэй рабі мяне дзяўчынкай! – узрадавалася Зорачка.

Чараўніца ўзмахнула сваёй чароўнай палачкай, і ў тую ж хвілінку Зорачка, успыхнуўшы, паляцела ўніз, на зямлю, пакідаючы за сабой яркі срэбны след…

Усё адбылося так, як і сказала Чараўніца.
Зорачка нарадзілася маленькай прыгожанькай дзяўчынкай у мамы і таты. У яе былі старэйшыя брацік і сястрычка, утульны пакойчык і шмат розных цацак. Яна была вельмі шчаслівая, усе любілі яе, і ёй вельмі падабалася на зямлі. Адно толькі наводзіла сум: кожную ноч дзяўчынка-зорачка засынала, яна бачыла многа цудоўных сноў, а раніцай мама казала ёй: “Маё сонейка, што табе снілася? Ты ўсміхалася ў сне…”

А дзяўчынка  зорачка нічога не магла ўзгадаць! Што ёй снілася, чаму яна ўсміхалася?

“Нічога не памятаю! – з горыччу думала Зорачка. -Можа, сёння ноччу запомню?” Так праходзілі дзень за днём, ноч за ноччу. Дзяўчынка-зорачка расла і хутка з немаўлятка ператварылася ў дарослую дзяўчынку.

Аднойчы да яе з’явілася нябесная Чараўніца і сказала: “Зорачка, твой час заканчваецца, табе трэба вяртацца на неба. Калі ты не вернешся зараз, ты ніколі не зможаш стаць зорачкай, назаўжды застанешся на зямлі”.

“Але дарагая Чараўніца! Я так і не даведалася, чаму дзеткі ўсміхаюцца ў сне! Можна я пабуду тут яшчэ трошкі?”
“Не, Зорачка, чараўніцтва заканчваецца. Выбірай: застаешся альбо ляціш на неба?”

“Застаюся! – упэўнена крыкнула Зорачка, - застаюся на зямлі!”
“Тады бывай! Жадаю табе даведацца пра тое, што табе так патрэбна!” –сказала Чараўніца і знікла.

А дзяўчынка зорачка засталася. Яна жыла далей з мамай і татам, сястрычкай і брацікам. Расла, хутка пайшла ў школу, ператварылася з дзяўчынкі ў дзяўчыну, а пасля ў дарослую жанчыну. У яе таксама нарадзіліся дзеткі. І кожную ноч, гледзячы на іх шчаслівыя расчырванелыя тварыкі, яна думала: “Што вы бачыце, чаму ўсміхаецеся ў сне?”



*Ганчарова Кацярына*
*Казка пра феечку Кукаляку і яе чароўнае пёрка*



Феечка Кукаляка была маленькая, тоўсценькая рагатушка. Калі яна смяялася, ніхто не мог утрымацца і не ўсміхнуцца разам з ёй. Гэта была самая вясёлая і радасная  з усіх вядомых фей і чараўніц.
Яна любіла печыва, малінавае варэнне і маленькія такія мармеладкі. Калі Кукаляка дзесьці з’яўлялася,  там абавязкова пачынала пахнуць нечым салодкім і смачным. У  дзяцей, якія ніколі не хацелі есці суп, раптоўна прачынаўся апетыт. Тыя, хто капрызнічаў і крычаў, заціхалі і пачыналі спакойна гуляцца, і ва ўсіх без выключэння на тварах з’яўлялася ўсмешка.

А яшчэ ў феечкі Кукалякі было чароўнае пёрка. Калі хтосьці з дзяцей ніяк не хацеў супакойвацца, яна даставала сваё чароўнае пёрка і пачынала хуценька казытаць ім плаксу, і тады дакладна плакаць было немагчыма толькі смяяцца!



Так феечка Кукаляка цэлы дзень лятала па горадзе (вы, ж напэўна, ведаеце, што феечкі лёгка могуць стаць нябачнымі, праходзіць праз сценкі і іншыя перашкоды) і суцяшала дзяцей, якія плакалі.

Аднойчы выдаўся такі цудоўны сонечны дзень,  дзеці амаль не плакалі, толькі адзін хлопчык, які баяўся ісці да доктара лячыць зуб. Феечка хутка яго супакоіла і ўжо думала ляцець  піць гарбату з мармеладкамі, як раптоўна пачула такі гучны, такі  страшны і крыклівы плач, што на момант нават не магла зразумець, адкуль ён ішоў. Здавалася, гэты крык-плач быў паўсюль: плакалі і крычалі дамы і дрэвы, птушкі і аблокі…

“Ой! Што здарылася з гэтым бедным дзіцёнкам? Ен захварэў? Згубіўся? Прышчаміў палец? Спужаўся?” Феечка Кукаляка перадумала ўсе магчымыя няшчасці, якія маглі адбыцца і хутчэй кінулася суцяшаць беднае дзіця.

Яна падляцела да акна. Трэба сказаць, што кватэра, адкуль даносіўся плач, была на пятым паверсе вельмі прыгожага дома, ва ўсе яе вокны радасна і ярка свяціла сонца. Феечка зажмурылася ад гэтага яскравага

святла і зазірнулі ў акно з прыгожанькімі фіранкамі, размаляванымі ў сланоў і ружовых бегемоцікаў.

“Нічога сабе!” – усклікнула феечка Кукаляка. Тое, што яна ўбачыла, вельмі яе здзівіла. На падлозе пасярод самага суперскага дзіцячага пакоя, які толькі можна сабе ўявіць, ляжаў маленькі хлопчык гадоў шасці-сямі, ён біў нагамі па дывану, круціўся і лупіў рукамі ўсе, што было вакол яго, і крычаў-крычаў-крычаў!
А вакол яго па ўсім пакойчыку былі раскіданы самыя файныя хлапчуковыя цацкі: машыны, цягнікі, канструктар, верталеты, кніжкі пра мора і лётчыкаў, лялечны тэатр і нейкія зусім незразумелыя для феечкі Кукалякі прылады (такіх яна не бачыла яшчэ ні ў воднага дзіцёнка!).

Але самае галоўнае, вакол хлопчыка стаялі мама, тата, дзве бабулі і два дзядулі. На іх тварах быў напісаны поўны адчай. Яны жаласлівымі галасамі спрабавалі ўгаварыць хлопчыка супакоіцца, прапаноўвалі яму за гэта шакалад, цукеркі і катанне на каруселях, казалі яму, як яны любяць яго… Але ўсё дарма! Хлопчык іх зусім не чуў і не хацеў чуць.

Феечка прашаптала чароўныя словы і аказалася ў пакойчыку побач са збянтэжанымі бацькамі. Зразумела, яна была нябачная.

“Вось дзіва! – ціхенька сказала Кукаляка.- Я бачыла слёзы столькіх дзяцей! Я суцяшала хлопчыкаў, якія плакалі ад таго, што ў іх увогуле не было цацак. Я супакойвала дзяўчынак, якія згубілі сваіх бацькоў. Я выцірала слёзы дзеткам, якім здавалася, што іх ніхто не любіць (таму што, насамрэч, заўжды ёсць хтосьці, каму ты дарагі!), дзетак без дамоў, без смачнай ежы і ежы ўвогуле, дзетак адзінокіх, хворых і сапраўды такіх няшчасных… Чаго ж не хапае гэтаму хлопчыку, які абкружаны такой любоўю і ўвагай?



Але пачакайце! Я зразумела, чаго табе не хапае, бедны, заплаканы хлопчык! – усклікнула феечка Кукаляка.  – Табе трэба навучыцца радавацца! Радавацца сонейку і цёпламу дню, усмешкам і добрым словам. Таму, які прыгожы і цудоўны наш свет. Таму, што ў цябе ёсць вочы, і ты можаш бачыць яго прыгажосць, ёсць ногі, і ты можаш устаць і пабегчы, куды хочаш. Ёсць рукі, каб зрабіць цуд альбо проста абняць кагосьці дарагога!  Ты такі шчаслівы, хлопчык!“

Так сказала Феечка Кукаляка і радасна ўсміхнулася. А за ёй пачалі ўсміхацца і дарослыя, што стаялі вакол хлопчыка. Феечка дастала сваё пёрка і прамовіла чароўныя словы: “Бурбулькі! Казюлькі! Плям!” (вы можаце запомніць гэтыя словы і паўтараць іх, калі будзе сумна. Абавязкова дапаможа!).

Пёрка падляцела да хлопчыка, дакранулася да яго тварыка, ручкі, пазказытала па спінцы… І вось і ён усміхнуўся, устаў з падлогі і кінуўся на шыю сваім бацькам. Радасна!

Феечка Кукаляка паклікала пёрка назад і, задаволеная, вылецела з пакоя. “Ён будзе памятаць, гэты хлопчык, што няма нічога больш важнага, чым радасць, і больш каштоўнага, чым любоў!” – падумала яна.- А я палячу хутчэй піць гарбату з мармеладкамі…”



*Даша Найба*
*Соль*

Не ведаю, даўно гэта было ці не, але адбылася гэта гісторыя ў маленькім горадзе Бон. Тут, у старэнькім доміку на Зялёнай вуліцы, жыў знакаміты ў гэтых месцах кампазітар Васіль Пятровіч Лойка.

Усе дні яго праходзілі ў звычайнай плыні: раніцай ён гуляў са сваім катом, палівай кветкі, а потым пісаў музыку. Але гэты месяц у яго быў вельмі напружаны, бо ён даваў канцэрт, грошы за які пойдуць на аперацыю маленькага хлопчыка Віці, у якога быў набыты парок сэрца.

Але калі падышоў дзень апошняй рэпетыцыі, Васіль Пятровіч не змог нічога сыграць: музыка заўсёды абрывалася, і замест прыгожай сімфоніі атрымлівалася няскладнае грукатанне. Доўга ён шукаў прычыну ў сабе, але так нічога і не знайшоў. А справа аказалася зусім у іншым.

У каралеўстве Нот здарылася бяда: нота Соль пасварылася сама з сабою і падзялілася на Со і Ль. Адбылося ўсё гэта ў звычайную раніцу, калі Соль зразумела, што яна не такая, як усе. Ва ўсіх яе сяброўак імя было кароткае і мілагучнае,а ў яе вельмі доўгае і незвычайнае.

-- Чаму ў мяне такое брыдкае імя? -- крычала яна ўсю раніцу. -- Не хачу быць такой! З гэтага моманту больш не будзе ноты Соль! Будзе Со і Ль!

Усе жыхары нотнага каралеўства былі вельмі напужаны навіной і ўгаворвалі Со і Ль, каб яны адумаліся і зноў сталі адной нотай:

-- Што вы робіце? Няўжо вы не разумееце, што вы не зможаце гучаць гэтак жа меладычна, як раней? Паслязаўтра ў нашага Васіля Пятровіча апошняя рэпетыцыя перад канцэртам.Што будзе, калі ён не зможа сыграць сваю вядомую сімфонію?

Але нота Соль не хацела нічога слухаць. Яе ніхто не мог угаварыць.

Не знайшоўшы прычыну ў сабе, Васіль Пятровіч вырашыў патэлефанаваць дырэктару канцэртнай залы і паведаміць, што выступленне адкладваецца на неазначальны час. Калі ноты пачулі пра гэта, яны пачалі ўгаворваць Со і Ль, каб яны памірыліся. І тут Ліга, якая доўга маўчала, раптам сказала:

--Няўжо ты не разумееш, што з-за таго, што ты не хочаш стаць ранейшай, можа страціць сваё жыццё той хлопчык, а самае галоўнае -- людзі ніколі не пачуюць цудоўнай музыкі, якая прабуджае ў іх сэрцах дабрыню!

Нотам Со і Ль стала вельмі сорамна за свае паводзіны, яны памірыліся і папрасілі ў жыхароў каралеўства прабачэння.

Вось так вырашылася гэтая праблема, але як сказаць аб гэтым кампазітару? Ён ужо тыдзень не падыходзіў да піяніна, бо думаў, што страціў свой талент.

Доўга абмяркоўвалі ноты, як выйсці з гэтага становішча, і вырашылі папрасіць дапамогі ў птушак.

З самага ранку, як толькі ўзышло сонца, птушкі зляцеліся на дрэва, якое стаяла каля хаты кампазітара, і кожная пачала спяваць сваю мелодыю. Атрымалася такая прыгожая музыка, што, калі Васіль Пятровіч пачуў яе, адразу паспрабаваў сыграць на піяніна. І о цуда! Мелодыя палілася так лёгка, быццам ручай ў вясновыя дні.
Не разважаючы ні хвіліны, Васіль Пятровіч што ёсць моцы пабег да тэлефона і паведаміў дырэктару канцэртнай залы, што ён дасць канцэрт.

Выступленне мела вялікі поспех. Дзякуючы ўсім людзям, якіх аб’яднала любоў да музыкі, у хлопчыка Віці з’явіўся шанс на светлую будучыню.



*Саша Песенка*
*Казка*

- Дзед, раскажы казку, – трэці раз папрасіў я. Дзед моўчкі перагарнуў старонку газеты.

- Дзед, раскажы каз-ку, ка-зку, каз-ку! – я пачаў грукаць кніжкай па стале: спадзяваўся звярнуць увагу на мае патрабаванні. Дзед - чалавек з крэпкай нервовай сістэмай, вайну прайшоў, але майго кленчу не вытрымаў.

- Што ты прывязаўся да мяне, як чорт да старой ігрушы! – ён падскочыў, скамячыў газету і набыў падабенства да толькі што ўзгаданага нячысціка.

- А чаму чорт прывязаўся да ігрушы? – дзеда я не баяўся.

- А чорт ведае чаму, - разгубіўся дзядуля.

- Раскажаш?

- Ды ідзі ты, - распачаў дзед, але я перапыніў:

- Куды?

- Сядай на канапу, - уздыхнуў ён, - хочаш казку - будзе табе казка.

Перамога была за мной.

- Гісторыя здарылася ў тыя часы, калі французскі імператар Напалеон ішоў са сваёй магутнай арміяй на Маскву. Вядома, ішоў праз гэтыя мясціны, ледзь не праз наш агарод. У мястэчку імператар спыніўся ў кавярні разам з генераламі і вышэйшым чынам і… з нячысцікам. Усе ведаюць, што чорт заўжды прымае выгляд іншаземца ў той мясціне, у якой з'яўляецца, але чаму – не. Вось чорт і выдаваў сябе за француза, каб павесяліцца і пазабаўляцца. Карчмар быў шчырым чалавека, гарэлка была ў яго добрая, вадой не разбаўленая, і нешта чорт не разлічыў сілы:

- Нон! Р'ё ду р'ян! Нон, жё нё регрета р'ян! – спяваў чорт ужо пад ранак, падхапіўся, ускочыў на стол, каб усе яго чулі, ударыўся галавой аб столь і страціў прытомнасць.

Ачуняў чорт пасля поўдня, галавы не адчуваючы.

- Карг'чмар, карг'чмар, - зваў чорт.

- Што табе? -- карчмар быў не ў духу.

- Мон шэрг', вады, – прасіў няшчасны нячысцік.

- Няма. Ды табе вада не дапаможа. Расолу б…



- Нёс’і цюда-расолу, - чорт ледзь размаўляў.
- Ваш брат мне павінен за ўчарашняе! З’ехалі,  а заплаціць? Я табе і снега зімой не даў бы! Расплачвайся і ты, – карчмар раззлаваўся.
Чорт рукою ў кішэню – раз, а грошай няма! Узгадаў чорт, што карты ўчора былі ў праграме адпачынку… Чорт задумаўся, потым зняў з пальца пярсцёнак і працягнуў карчмару:
- Трымай.



- Жартачкі! Ты выпіў на 10 такіх пярсцёнкаў.
- Змоўкні, - чорт пачаў прыходзіць у сябе, - за гэты пярсцёнак гінулі тысячы рояў, знікалі цэлыя цывілізацыі, браты забівалі братоў, прадавалі бессмяротную душу і тапталі крыж.
- Здольны ты, шляхціц, мовы размаўляць, - гаспадар карчмы збялеў з твару, - давай сюды свой пярсцёнак. Будуць табе лекі…
Чорт выпіў расолу, апрытомеў.
- Беражы пярсцёнак, карчмар, я за ім прыеду, – сказаў так і сышоў прэч.
Карчмар паскуб галаву, пацінуў плячыма і пайшоў па сваіх справах. Колькі дзён прайшло, карчмар узгадаў пра пярсцёнак, надзеў, бо быў цікаўны. Тут якраз зайшоў да яго сусед пазычыць грошай.
- Калі аддасі?
- Дык хутка… дык на тым тыдні, -- адказвае сусед.
І бачыць наш карчмар, што цёмныя словы выплёўвае сусед. Зразумеў, хлусіць, а яшчэ зразумеў, што за рэч яму ў рукі трапіла. Хлусню і праўду бачыць чалавек – уладар пярсцёнка.

Прайшло паўгода. Адным ясным днём дзверы адчыніліся, і ў пакой зайшоў чорт.
- Ну, карг’чмар, трымай г’рошы, аддавай мой пяр’сцёнак.
Карчмар не спяшаючыся праціраў куфлі.
-Дык у мяне яго няма.
-Як?!
- Не турбуйся, ты ж прасіў яго берагчы, вось я яго і схаваў. Закапаў пад старой ігрушай на ўскрайку мястэчка, там, дзе цень падае.

Чорт узяў рыдлёку ў карчмара і пайшоў на ўскраек. Знайшоў тую грушу і пачаў капаць, дзе цень ляжыць. Рые, рые, рые, а пярсцёнка няма. Стаміўся, прысеў адпачыць. Бачыць – цень ад грушы ўжо не там, дзе ён капаў. Зноў кінуўся капаць, і зноў цень пасунуўся, і зноў, і зноў здаралася тое самае да самага вечара. На наступны дзень чорт капаў і на наступны. Жыхары мястэчка ходзяць побач, смяюцца.

- Чаго ты прывязаўся да гэтай старой грушы? – пыталіся ў яго, а нячысцік моўчкі капаў.

Зямлю навокал усю вырыў, на многія метры ўніз і ўздоўж. Так бы і капаў, але ж хутка прыйшла зіма і свята Раства, чорт кінуў грушу і ўцёк у пекла, бо не можна нячысцікам хадзіць па зямлі ў гэты час. Людзі ж пачалі казаць пра таго, хто адчапіцца ад іншага не можа: “Вось прычапіўся, як чорт да старой ігрушы”.

Дзед скончыў казку, а мне стала крыху няёмка.



*Віталь Воранаў*
*Чатыры чаўны*

Усе мы ведаем, што напачатку ў свеце панаваў бясконцы хаос, але многія не ведаюць чаму. Справа ў тым, што калі нараджаліся месяцы, іх бацька Час быў задрамаў. Таму ніхто -- ні дзед Час, ні маці Прастора -- толкам не ведаў, у якім парадку малыя з'яўляліся на свет. Тым больш было невядома, якія імёны ім даць. Так і гадаваліся яны без імёнаў, а на зямлі ў гэты час панавала поўнае бязладдзе. Пасля лютых маразоў распачыналася нязносная спёка, ліўні чаргаваліся з засухамі, парослыя ў лесе грыбы тут жа мог накрыць высокі снег, невядома было, дзе заканчваецца шэрая імгла, а дзе пачынаецца сонечная дымка. Калі месяцы павырасталі і сталі падобныя да сапраўдных волатаў бацька Час паклікаў іх да сябе і сказаў:

- Васямнаццаць гадоў на зямлі не было ні ладу ні складу. Прыйшоў той момант, калі вам трэба знайсці сваё кола – вызначыць, хто наступае за кім, а хто каму папярэднічае. Адзін толькі бог Лада можа дапамагчы вам адшукаць парадак і зрабіць так, каб усё пайшло сваім, належным кругам. Жыве ён, аднак, вельмі далёка, за вялікім возерам, за грузкім балотам, за плыткім ручаём і за шырокай ракою. А на дарогу вашу даю вам чатыры чаўны.

Узялі браты чаўны і выправіліся ў шлях. Вельмі доўга яны ішлі праз лясы і палі, пакуль не апынуліся на беразе вялікага возера. Перад вачыма раскінулася даўжэзнае, ні канца ні краю возера. Браты месяцы пачалі класці свае чаўны на возера, а адзін з іх кінуўся да вады самы першы. Неабачліва, калі ён забег у ваду, яна тут жа перамянілася ў лёд. Браты раззлаваліся на яго, таму што пешкі на другі бок было не перабрацца і плыць у чаўне немагчыма, калі пад нагамі таўшчэзны лёд. Тут наперад высунуліся тры браты, якія спраўна ўмелі рэзаць лёд і перамяняць яго ў ваду. Пакуль астатнія дзевяць братоў з берага назіралі, як растае лёд, тры браты рабілі сваю працу, а калі ўсё было скончана, яны сказалі:

- Вось мы ўтрох перамянілі лёд у ваду. Сядайце ў чоўны і плывіце, а мы адпачнем трошкі і выправімся за вамі ўслед.

Пасядалі браты тройкамі ў тры чаўны і пачалі грабсці да далёкага, ледзь рысачкай азначанага на гарызонце берага. Так граблі вельмі-вельмі доўга,

але праз нейкі час яны ўсё ж пабачылі другі бераг. З радасцю браты пачалі грабсці хутчэй. Калі ўсе тры чаўны ўжо прыбіла да берага, адзін з братоў з трэцяга чаўна быў такі шчаслівы ад убачанай зямлі, што ажно выскачыў у ваду, каб хутчэй стаць нагамі на дне. У гэты момант вада ў возеры цалкам перасохла. У гэты час тры браты, якія засталіся на другім беразе, ужо добра адпачылі і сядалі ў човен, але пабачылі перад сабою толькі вялікую пясчаную пустыню. Тыя, што перабраліся праз возера, доўга думалі, што рабіць. Думалі-думалі, аж урэшце зразумелі, што далей прыйдзецца вандраваць удзевяцёх. Таму пабралі свае чоўны на плечы і рушылі ў свой шлях, аднак не паспелі яны зрабіць і пару крокаў, як пад нагамі ізноў адчулі ваду. Гэта было грузкае балота.

Ледзь крануцца браты з месца, як тут жа ногі западаюцца па калена ў балоце. Сталі думаць браты, што рабіць, ажно ўрэшце кажуць таму брату, што возера высушыў:

- Ці не мог бы ты высушыць і балота?

- Паспрабую, – сказаў брат і ўзяўся за працу. І хаця ў балоце было менш вады, чым у возеры, але, прамоклае нават у глыбіні зямлі, асушэнню яно паддавалася нашмат цяжэй, чым возера. Пабачыўшы, што адзін ён з гэтым не спраўляецца, падцягнуліся яму ў падмогу іншыя два браты, якія таксама, як ён, зямлю спраўна сушыць умелі. Калі балота цалкам перасохла, тры браты сказалі астатнім:

- Вы бярыце ў рукі чоўны і прабірайцеся праз купнік, а мы адпачнем трошкі і пойдзем за вамі ўслед.

Пабралі браты ізноў чоўны і пайшлі па сухім дне калісь грузкага балота. Так ішлі яны па сухіх купінах, ажно купіны пачалі радзець і ўрэшце цалкам зніклі. Усе ад радасці прыбавілі ходу, а адзін брат, што нёс другую лодку, ажно расплакаўся ад шчасця. Праз некалькі хвілінаў купнік ізноў напоўніўся вадою. А той брат, што расплакаўся, апынуўся па шыю ў грузкім балоце і заграз. Убачыўшы гэта, іншы брат кінуўся яму на дапамогу і, калі быў ужо амаль выцягнуў яго на бераг, ад стомы сам аступіўся адною нагою ў балота, і ўся вада ў балоце тут жа пакрылася коркай лёду. Тыя тры

браты, якія засталіся з другога боку балота, былі ўжо набраліся моцы і бралі ў рукі свае чоўны каб дагнаць астатніх ажно пабачылі перад сабою не сухое балота, а пакрытае тонкім лёдам багнішча. Яны зразумелі, што на другі бок ім прабрацца немагчыма. Тым часам тыя, што перабраліся чакалі-чакалі, ажно пастанавілі, што далей прыйдзецца ісці ўшасцёх. Не паспелі яны, аднак, і развярнуцца, як пабачылі перад сабою плыткі ручай.

Магчыма, яны б адолелі гэты ручай і пешкі, але сілаў несці човен на плячах ужо не было. Таму прыдумалі браты папрасіць таго брата, што выпадкова заліў вадою балота, паспрабаваць напоўніць ручай так, каб па ім можна было плыць. Пачаў брат ліць слёзы, але слёзаў, каб разліць ручай, неставала, бо шмат з іх ён выплакаў на балоце, таму на дапамогу прыйшлі два іншыя браты, якія тут жа нагналі такіх хмараў, што плыткі ручай праз нейкі час перамяніўся ў хуткую рэчку. Стомленыя працай браты сказалі астатнім:



- Вы плывіце, а мы адпачнем і дагонім вас.

Селі браты ў човен і паплылі ўніз па цячэнні. Плылі яны, здавалася, бясконца, а гук вады з плыткага станавіўся ўсё больш і больш суцэльны і пранізлівы. Не пасьпелі яны азірнуцца, як зразумелі, што ручай нясе іх у шырачэзную раку з хуткаплынным цячэннем, якое можа знесці іх немаведама куды. Спахапіўшыся, браты ўраз павыскоквалі з чаўна ў ручай, каб сілай рук затрымаць човен ад пападзення ў шырокую і моцную раку. Не паспелі яны, аднак, добра дакрануцца да паверхні, як вада ў ручаі тут жа ператварылася ў тоўсты лёд. Тыя браты, што засталіся адпачыць, клалі якраз свой човен на ваду, калі замест вады перад імі паўстала шкляная глыба. Тры браты, якія стаялі цяпер каля вусця, месца, дзе застылы ручай перасякаўся з шырокай ракою, зразумелі, што на другі бок ракі ім прыйдзецца перабірацца ўтрох. Яны ведалі, што рака надта шырокая і хуткаплынная, каб праз яе перабірацца на чаўне, таму было пастаноўлена паспрабаваць замарозіць яе і перабрацца на другі бок пешкі. Тут жа браты ўзяліся за справу, але рака была такая шырокая і такая магутная, што праца ішла вельмі марудна. Адзін з братоў ледзь змог замарозіць той бок

рэчкі, на якім яны стаялі, другі, наймацнейшы з іх трох, з натугай адолеў абледзяніць хуткую плынь шырокай ракі, а трэці не без цяжкасцяў пакрыў лёдам аддалены бок ракі, той бок, па якім жыў бог Лада. Аднак лёд над шырокай ракой быў усё яшчэ такі тонкі, што на ім ледзь можна было ставіць нагу. Браты зразумелі, што на другі бок зможа перабрацца толькі адзін з іх, той што бліжэй да другога берага. Ступіў адзін брат на бераг і пабачыў перад сабою Лада, бога які трымаў парадак на зямлі.

- Васямнаццаць гадоў у нас не было ні ладу ні складу, ні нават сваіх іменаў. Наш бацька Час паслаў мяне і адзінаццаць братоў маіх да цябе, каб ты вызначыў хто наступае за кім, а хто каму папярэднічае, каб усё пайшло сваім, належным кругам. Аднак праз вялікае возера пераплыло дзевяць з нас, праз грузкае балота перабралася шэсць, плыткі ручай адолелі мы ўсяго ўтрох, а праз крохкі лёд шырокай ракі змог пераступіць толькі я адзін. Відаць, ніякага ладу нам знайсці не наканавана.

- Вы ўжо знайшлі свой лад, – нечакана для месяца сказаў Лада. – Нездарма ваш разумны бацька Час даў вам чатыры чаўны: адзін для тых, што ўмеюць лёд распускаць, адзін для тых, што могуць вадаёмы асушаць, адзін для тых, што патрапяць мель падымаць, і адзін для тых, што ваду лёдам скоўваюць. Нездарма трое з вас не перайшлі праз вялікае возера, трое не пераадолелі грузкае балота, трое не праплылі праз плыткі ручай, і толькі ты адзін дабраўся да сваёй мэты. Таму ты будзеш першы месяц, і імя тваё будзе Студзень, твой брат, што плынь замарозіў, будзе Люты, а трэці, што на другім беразе, будзе звацца Снежань. Аднак за тое, што брат твой Снежань быў неабачлівы і першым кінуўся да вялікага возера, ён заўсёды будзе ісці быццам бы перад вамі, але ўсё адно на самым канцы. Човен ваш будзе звацца Зіма. За вамі будзе ісці човен Вясна, а ў ім паплывуць Сакавік, Красавік і Травень, затым пойдзе човен Лета, у якім будуць Чэрвень, Ліпень, Жнівень, за імі човен Восень, у ім Верасень, Кастрычнік, Лістапад. І так усё будзе плысці колам часу, з года ў год. Падзякаваў разумнаму Ладу Студзень і хацеў быў ужо вяртацца, як зразумеў, што не ведае яшчэ, як усім братам цэлымі і ў поўным зборы

дабрацца дадому.

- Цяпер, калі вы ведаеце свой парадак, – апярэджваючы Студзенева пытанне, пачаў Лада, – дабрацца назад будзе нашмат прасцей. На пачатку года валадарыць будуць Студзень і Люты, за гэты час вы ўсе сухой нагою па лёдзе перабярэцеся праз шырокую раку, затым, калі прыйдзе час Сакавіка, Красавіка і Траўня, растопяцца снягі і лёд, напоўніцца вадою плыткі ручай, вы сустрэнеце сваіх братоў пасярэдзіне ручая і ўшасцёх апыніцеся там, дзе ручай пачынае свой бег. Тады прыйдзе чарга Чэрвеня, Ліпеня, Жнівеня, перасохне грузкае балота, вы сустрэнеце іх пасярод балота і ўдзевяцёх ізноў пяройдзеце яго пешкі. Калі станеце на беразе высахлага вялікага возера, а яго пешкі не перайсці, вы пачакаеце, пакуль запануюць дажджлівыя Верасень, Кастрычнік, Лістапад, якія ізноў напоўняць возера вадою, сустрэнеце іх пасярод возера і пераплывяце на другі бераг, каб у поўным зборы праз год апынуцца дома.

Падзякаваў Студзень богу Ладу і выправіўся ў шлях. Вандравалі браты цэлы год. Спярша панавалі адны, пасля валадарылі іншыя, саступалі месца тым, што былі ў чарзе, усё так, як сказаў Лада. Каб у дарозе не нудзілася, яны прыдумлялі сабе розныя прыказкі, а адна з іх нават засталася вядомая па сённяшні дзень: “Пытаецца люты, ці добра абуты”. Дадому браты месяцы вярнуліся вельмі шчаслівыя, бо ўрэшце запанаваў належны лад. І толькі Снежань з-за таго, што яму трэба было ісці быццам першым, але ўсё ж апошнім, не пераставаў сумаваць. Таму маці Прастора, каб падбадзёрыць Снежня, сказала: “Хаця ты і апошні, але ж з усіх братоў наймаладзейшы і наймілейшы мне, а таму кожны раз пад канец тваёй чаргі валадарання мы будзем спраўляць вялікае свята – Навагоддзе. А паколькі якраз была пара ягонага панавання, Снежань тут жа павесялеў і пакінуў свой сум. З гэтага часу ўсё закруцілася сваім нязменным і няспынным колам. У кожнага брата месяца нарадзілася па чатыры сыны, а ў кожнага з гэтых сыноў па сем сыноў і дачок. Адна з гэтых дачок, штораз іншая, штоноч прыходзіць, каб кожнаму з нас ласкава падзьмуць на вейкі ў момант, калі засынаем.

*Мікола Дзятчэня*
*Аповяд пра Добрага Вожыка, які хацеў стаць злым.*

Жыў сабе ў нейкім лесе Добры Вожык. Не малады ўжо, але яшчэ і не стары. Любіў ён гуляць па лесе і есці марозіва. Побач з норкай жыла ягоная лепшая сяброўка Вавёрачка.
– Вітаю, Вавёрачка. Як маешся? – заўсёды пытаўся Вожык, праходзячы міма.
– А і добра, -- адказвала яна, -- арэхі сёлета надта добрыя. – І бегла па сваіх справах.
Штораніцы Вожык мыўся ў невялічкім возеры. Там ён сустракаўся з Трусікам, і яны разам хадзілі гуляць па лесе.
Добрага Вожыка любілі ўсе звяры. Вось толькі з Лісою не ладзілася.
Не давала яна Вожыку спакою. Як толькі ўбачыць, так і давай ганяцца.
Прыходзілася яму быць асцярожным.
Але ўсё ж не магла злапаць Ліса Вожыка. То ў кусцікі схаваецца, то звернецца ў клубок, і дзе ты яго, вострага, дастанеш.

І неяк аднойчы сядзеў Вожык у кусціках і троссяа – зноўку Ліса ледзьве не злапала яго.
“Усе баяцца рыжай, -- думаў Вожык, -- а мяне ніхто не баіцца. Вось і прыходзіцца хавацца. Мабыць, гэта таму, што яна злая і нікога не любіць, а я добры. Вось таму і кепска мне”.
Гэтак паразважаўшы, Вожык і вырашыў: “Усё, заўтра буду злым, каб мяне таксама ўсе баяліся.” З такою думкаю ён і заснуў.

Раніцаю Вожык выйшаў са сваёй норкі і ўбачыў Вавёрку.
– Пр... – хацеў сказаць “прывітанне”, але змоўк.
“Мне ж трэба быць злым!”
– Гэй, Вавёрка!
– Прывітанне, Вожык!
– Хадзі сюды!



Вавёрачка спусцілася з дрэва, зацікаўленая, што ж хоча Вожык.
– Адгадай, што ў мяне ў руцэ?
– Арэхі? – спытала Вавёрачка і пачала падскокваць вакол.

– А вось і не адгадала, – сказаў Вожык і ўкалоў яе іголкай, – гэта іголка!
– Вой, – ускрыкнула Вавёрачка і скокнула на дрэва.
– Аха-ха, – засмяяўся Вожык і пабег шукаць Лісу, ужо не чуючы, як плача ягоная сяброўка.

Ліса ляжала на палянцы і грэлася на сонейку.
– Гэй, Ліса! – крыкнуў Вожык.
– А, вось ты мне і папаўся, -- узрадавалася Ліса.
– Не, гэта ты мне папалася! – Вожык звярнуўся ў клубочак і пакаціўся на Лісу. А рыжая ніяк не магла зразумець, што ж гэта такое робіцца.
– Вой, -- сказала Ліса, калі Вожык укалоў яе ў бок, -- вой, вой, вой, -- яна хацела схапіць Вожыка лапкай, але зноўку ўкалолася.
– Ая-я-я-яй, -- крыкнула Ліса і пабегла хутчэй ад Вожыка.

А Вожык стаяў на палянцы і смяяўся: “Вось так, Ліса, будзеш ведаць, як са мною звязвацца”.

“Вось так, – разважаў ён, – цяпер я стаў злы, і мяне баяцца нават мае сябры.”

І Вожык заплакаў.

На наступную раніцу, калі ўсе звяры ў лесе яшчэ спалі, Вожык прынёс пад дрэва Вавёрачкі мяшочак з арэхамі, каля Трусікавай норкі ён пакінуў качан капусты і некалькі морkваў, а Курачцы насыпаў цэлую талерку зярнятак.
– Вой, – здзівіліся звяры, – няўжо Вожык зноў стаў добрым?

З гэтага часу ўсе звяры ў лесе ведалі, што Вожык стаў злым і яго лепш не кранаць, бо ён надта балюча можа ўкалоць. І Ліса цяпер за ім не ганялася.

І вось наступіў самы чаканы дзень у годзе. Сёння ў Вожыка дзень народзінаў. З самае раніцы ён круціўся каля пліты і гатаваў розныя смачныя стравы. Для Трусіка ён нагатаваў салатаў з морквы і капусты, для Курачкі прынёс розных зярнятак, а для Вавёрачкі назбіраў шмат арэхаў. Наступіў прызначаны час, але ніхто не прыйшоў.
“Дзіўна, – падумаў Вожык, – можа, яны нясуць вялікі падарунак і таму спазняюцца.”

Сонейка паціху спаўзло на край лесу, надышоў вечар, а госці так і не прыйшлі.
Тады Вожык выйшаў са сваёй норкі і пакрочыў да дрэва, дзе жыла Вавёрачка.
– Вавёрачка-а-а, -- гукнуў Вожык.
– Чаго табе? – спытала яна.
– А чаму ты да мяне не прыйшла ў госці, у мяне ж сёння дзень народзінаў?
– А ты злы і будзеш калоцца.
– Не, не буду.
– Я ведаю, ты мяне падманваеш, не пайду да цябе, – сказала Вавёрачка і схавалася ў сваю хатку.

Вожык вярнуўся дадому, убачыў пустую норку, накрыты стол, і яму стала сумна-сумна.

А праз год, на дзень народзінаў да Вожыка прыйшло шмат сяброў. Яны елі смачныя стравы, жартавалі і смяяліся.
"Не-е-е, – падумаў ён, – лепш быць добрым, а з Лісой я як-небудзь разбяруся."



*Дар’я Вашкевіч*
*Леў і Васіліна*

Матылёк Леў жудасна не любіў сваё гучна-пагрозлівае імя. Справа ў тым, што, насуперак яму, Леў быў дужа сціплы, сарамлівы і крыху баязлівы. Найвялікшая ж бяда палягала ў тым, што ён не ўмеў лётаць, хоць матыльком быў ужо досыць дарослым.
— Мама, ну нашто вы з татам мяне так назвалі?! З мяне ж усе іншыя казюркі ў двары кпяць! — часцяком крычаў Леў, заламваючы ў роспачы крыльцы.
— Лёвушка, нікога не слухай! Ты — найпрыгажэйшы, найразумнейшы ды найсмялейшы матылёк! — супакойвала сына мама.

Ну, з “найсмялейшым” яна, канешне, трохі перабольшыла, але ў астатняе шчыра верыла. Як усе мамы. Але Лёву ад маміных словаў лягчэй не станавілася.
Ён вельмі баяўся лётаць. Як толькі матылёк набліжаўся да края даху, пад якім жыла ягоная сям’я, у яго пачынала круціцца галава, уваччу ўсё плыло, і станавілася млосна. Некалькі разоў ён нават губляў прытомнасць. Таму, каб выйсці ў двор пагуляць, Лёву даводзілася прасіць свайго знаёмага — верабейчыка Грышку, каб той спусьціў яго долу на сваёй сьпіне. Пры гэтым Лёва моцна заплюшчваў вочы і адчайна хапаўся за пёркі вераб’я.

Назіраючы за чарговым спускам Лёвы на спіне ў Грышкі, усе мясцовыя казюркі заходзіліся смехам. Асабліва дасціпныя жартавалі: “О, Леў на вераб’і ляціць!”



Так працягвалася датуль, пакуль аднойчы не здарыўся наступны выпадак. Лёва, як звычайна, спусціўся на спіне Грышкі ў двор і гуляў там, самотны, у гушчары травы, гушкаючыся на травінках-кветачках. Раптам аднекуль зверху пачуўся адчайны піск. Задраўшы галаву і прыгледзеўшыся, Леў заўважыў, што высока-высока, заблытаўшыся сярод павуціння, нацягнутага сярод галінаў рабіны, б’ецца маленькі вусень. Аднак як малеча ні намагалася, вызваліцца ў яго не атрымоўвалася, а зверху павуціны да небаракі ўжо падбіраўся велізарны чорны павук.

Леў анямеў ад страху. “Памажыце!” — загаласіў ён… Але паблізу, як назло, нікога не было.
Тым часам павук падбіраўся да вусеня ўсё бліжэй, бліжэй... Той ужо ахрып ад крыку і толькі сіпеў. Павук наблізіўся да сваёй ахвяры амаль усутыч… І тут Леў, сам не разумеючы, як гэта адбываецца, паляцеў. Ён так адчайна махаў крыльцамі, што літаральна за некалькі секунд здолеў узняцца да вяршаліны рабіны, схапіць вусеня і штомоцы пацягнуць таго да сябе.

Павуціна парвалася, Лёва абхапіў вусеня лапкамі і паляцеў прэч. Ён быў настолькі спуджаны, што і не ўцяміў, як трапіў дахаты. Там яго разам з вусенем сустрэлі бацькі, аднак, бачачы, які ён усхваляваны, не сталі надакучваць пытаннямі, а захуталі сына ды ягонага новага знаёмага коўдраю, напаілі іх цёплым дзьмухаўцовым малаком…

Як толькі Леў крыху супакоіўся і адчуў сябе ў небяспецы роднага дома, ён расслабіўся і… неўпрыкмет заснуў. Прычым так глыбока, што прачнуўся толькі праз 3 дні!

Соладка пацягнуўшыся, ён пазяхнуў, вылез з ложка, куды яго, соннага, перанеслі бацькі, і накіраваўся ў кухню. Там завіхалася мама. Убачыўшы сына, яна ўсміхнулася і загадкава прамовіла: “А ў нас госць…ця!” Лёва зазірнуў у залу — і аслупянеў: там сядзела найпрыгажэйшае ў свеце стварэнне: яе далікатныя крыльцы пераліваліся ўсімі колерамі вясёлкі, аксамітныя лапкі элегантна выгіналіся, а чорныя вусікі задорна дрыжалі.

— Прывітанне… — разгублена сказаў Леў.
— Прывітанне!.. Ты, пэўна, мяне не пазнаеш? — гулліва запытала Найпрыгажэйшае ў Свеце Стварэнне.
— Не збыт, — прызнаўся Лёва.



— Эх, кароткая ў хлапцоў памяць! — мовіла Стварэнне і, вытрымаўшы драматычную паўзу, дадала: Я — Васілінка-матылінка. Ты надоечы выратаваў мяне ад смерці, выцягнуўшы з лапаў павука. Ну, тады я, канешне, яшчэ была вусенем… А цяпер вось… Я, дарэчы, сочыва табе прынесла. З канюшыны! Ты любіш канюшыну?

Леў моўчкі, але дужа актыўна захітаў галавой у знак згоды.
—Бачу, ты не дужа гаваркі! — засмяялася Васілінка. — Але, мяркую, мы паладзім! — І хітра падміргнула.

Паколькі матылінкі рэдка памыляюцца, то так яно і адбылося: Леў і Васіліна пасябравалі, штодзень лёталі разам (Лёва дазнаўся, колькі ўсяго цікавага навокал), частаваліся нектарам з кветак… І ніхто ўжо не кпіў са Льва, бо ён зусім кінуў баяцца і вырабляў у паветры такія віражы, што нават Грышка часцяком зайздросціў. І, самае галоўнае, Лёва палюбіў сваё імя і нават стаў ім ганарыцца. Цяпер ён сапраўды пачуваўся найпрыгажэйшым, найразумнейшым і найсмялейшым матыльком.

А яшчэ мама Лёвы сцвярджае, што яны з Васілінкай адзін ў аднаго закаханыя. Гэта вельмі магчыма, хоць, як вядома, мамы часам могуць і перабольшваць.



*Сяргей Балахонаў*
*Як лісічка да хворай сястрычкі бегала*

Жыла-была лісічка. І была ў яе сястрычка, якая жыла за трыццаць тры вярсты ад яе.

Аднойчы сястрычка захварэла і адправіла лісічцы мышку-пабягушку з гэтай горкай весткай.

Даведалася лісічка пра хваробу сястрычкі, сабрала лекі ды тры бляшаначкі згушчанага малака і рушыла ў няпросты шлях.

А самая кароткая дарога да сястрычкі ляжала праз шэры закінуты горад. Бяжыць, бяжыць лісічка па галоўным праспекце, колькі мае сіл. А з руінаў страшыдла-абрыдла ўзнікае, дарогу перад ёй заступае.

– Пусці мяне страшыдла-абрыдла! Мне да хворай сястрычкі патрапіць трэба! – узмалілася лісічка.

– Дай мне бляшаначку згушчанага малака, я цябе і прапушчу, – сказала страшыдла.

Рыжанькая так і зрабіла і неўзабаве працягнула свой шлях.

Бяжыць, бяжыць яна далей, аж выжыльваецца. А з адчыненага люка шалёны канёк-крывабок узнікае, дарогу перад ёй заступае.

– Пусці мяне канёк-крывабок! Мне да хворай сястрычкі патрапіць трэба! – загаласіла лісічка.

– Дай мне бляшаначку згушчанага малака, я цябе і прапушчу, – сказаў канёк.

Рыжанькая так і зрабіла і неўзабаве працягнула свой шлях.
Бяжыць, бяжыць яна далей. На другі канец горада дабягае. Ледзь дыхае, ды спачыну не робіць. А з іржавага аўтобуса чарадзей-барадзей узнікае, дарогу перад ёй заступае.

– Пусці чарадзей-барадзей! Мне да хворай сястрычкі патрапіць трэба! – зарумзала лісічка.

– Дай мне бляшаначку згушчанага малака, я цябе і прапушчу, – сказаў чарадзей.

Рыжанькая так і зрабіла і неўзабаве працягнула свой шлях.
Прыбегла лісічка да сястрычкі. Лекі аддае.
– А пачастунку, – кажа, – няма. На дарозе страшыдла-абрыдла, канёк-крывабок і чарадзей-барадзей па бляшаначцы згушчанага малака забралі.
– Не журыся, – кажа сястрычка. – Заставайся ў мяне. Будзьма жыць-пажываць ды згушчанага малачка нажываць. Нездарма ж дзядуля вялікі ліс Патрыкей пакінуў мне ў спадчыну згушчанкавую фабрыку.

Лісічка згадзілася. І стала ім шчасліва.

А што з жыхарамі шэрага горада сталася, дык то ўжо іншая казка. Яе без мёду на вуснах не прабаеш.

24-25 чэрвеня 2010 г.



*Палінка Торбачка*
*Жалудок*

На самай маленькай, самай тоненькай і самай далёкай галінцы вялікага магутнага дуба рос Жалудок. Так сталася, што ён жыў там адзін. Шмат ягоных сяброў усе разам раслі далёка -- на іншых, таўсцейшых галінках. Калі ён бачыў, як астатнія жалудкі разам смяюцца, яму станавілася сумна і адзінока. Ен клікаў іх, каб яны заўважылі яго і сталі ягонымі сябрамі, але ж ён рос так далёка ад астатніх, што яны яго не чулі.

Халодныя дажджы і хуткія ветры здзекваліся з яго, штурхалі з бока ў бок, дзьмулі і дзьмулі на яго. І ён трываў, бо не мог заступіцца за сябе.
“Я такі слабенькі, маленькі і адзінокі, што мне прыходзіцца кожны дзень плакаць, -- думаў Жалудок. -- У мяне няма сяброў, якія маглі б абараніць мяне і парадаваць мяне. І я не магу дапамагчы нікому”.

Так, кожны дзень Жалудок жыў у роспачы, што не можа нічога змяніць, пакуль аднойчы на суседнюю галінку не прыляцела птушка.
-- Гэээй, Птушкааа, -- закрычаў Жалудок. -- Птушка, гэта я -- Жалудок, паглядзі налева.
Птушка аазіралася, пакруціла галавой і, убачыўшы маленькага Жалудочка, скокнула бліжэй.



-- Чаго табе?
-- Прывітанне, скокні да мяне- будзь маім сябрам. У мяне няма сяброў.
-- Я не магу, -- адказала Птушка, -- твая галінка вельмі маленькая, я магу ўпасці.
-- А як жа нам сябраваць? Я так хачу мець сябра, бо я расту тут зусім адзін, вецер і дождж робяць мне холадна і балюча.
-- Вось калі вырасцеш у вялікае дрэва, якое не зможа зламіць ні ветрык, ні дождж, у цябе з’явіцца шмат сяброў, і я буду прылятаць да цябе кожны дзень.
-- Як я магу стаць вялікім дрэвам, я ж усяго маленькі Жалудок?
-- Табе трэба адарвацца ад галінкі, упасці на глебу -- яна стане тваім першым сябрам. Ты толькі не бойся -- складана адрывацца і мяняць жыццё, але мары вартыя ахвяраў.





І Птушка паляцела, пакінуўшы Жалудка з новымі, цікавымі, але страшнымі думкамі. Але ён не пабаяўся і кінуўся ўніз -- у невядомае новае жыццё.

Прайшло нямала часу, і на месцы, дзе ён сустрэў глебу, якая аказалася мяккай і добрай, рос магутны, стройны, упэўнены Дубочак. І сапраўды Птушка стала прылятаць да яго кожны дзень, распавядала, што робіцца ў свеце, яны смяяліся і радаваліся.

Дубочак-Жалудочак быў шчаслівы. Ні ветрык, ні дожджык ужо не былі страшныя яму, бо ён не пабаяўся рызыкнуць і стаў моцным вялікім дубам.



*Віталь Быль*
*Піраты*

Жылі-былі на белым свеце піраты. Плавалі яны па морах-акіянах ды людзей добрых крыўдзілі. Убачаць дзяўчынку з лялькамі – забяруць лялькі, ды яшчэ за косы пацягаюць. Убачаць хлопчыка з машынкамі – машынкі забяруць, ды яшчэ пстрычак у лоб надаюць. Убачаць дзяцей, што ў пясочку гуляюць, – формачкі паламаюць, замкі патопчуць, ды яшчэ словамі дрэннымі паабзываюцца. Плачуць дзеці ў тры ручаіны, слёзкі па тварыках размазваюць, а піраты смяюцца, радуюцца: “Якія мы моцныя ды страшныя! Усе нас баяцца!

Плывуць яны раз, ажно бачаць: сядзіць дзяўчынка Аленка і гуляе сабе, забаўляецца, ад піратаў не ўцякае. Здзівіліся піраты, кінуліся да яе, крычаць-пужаюць:

-- О-го-го! Мы -- страшныя піраты! Бойся нас! Аддавай свае цацкі, а то дрэнна будзе!

-- А я вас не баюся, -- кажа Аленка і весела ўсміхаецца.

-- Як так? – здзівіліся піраты. – Мы – страшныя разбойнікі! Жах мораў і акіянаў! Нас усе баяцца, і ты таксама бойся! А не то паб’ем!

-- А з вас усе будуць смяяцца і пальцам паказваць – глядзіце, яны біліся з дзяўчынкай! Фу, ну якія піраты б’юцца з дзяўчынкай?!

Падумалі-падумалі піраты і згадзіліся: так, не па-пірацку гэта, не па-геройску. А яшчэ падумалі: “А раптам яна нас паб’е? Во сораму не абярэшся! Пальцамі ўсе затыцкаюць…”

-- Ну, добра, мы пойдзем, -- кажуць.

-- Э, не, -- адказвае разумная Аленка. -- Спачатку вярніце ўсім тое, што вы адабралі. А не то будзем біцца, і з вас усе будуць смяяцца: фу, б’юцца з дзяўчынкай!

Страшна стала піратам – не хочуць, каб з іх смяяліся. І пайшлі яны вяртаць нарабаванае: лялькі – дзяўчынкам, машынкі – хлапчукам, а замест паламанага – па цукерцы шакаладнай. Пашкадавала іх Аленка, толькі карабель забрала, і з таго часу ўсе дзеці могуць на ім катацца. А піраты больш нікога не крыўдзяць, вудзяць рыбу ды дрэсіруюць папугаяў.



*Таберка Кацярына*
*Казка пра белую фарбу*

-- Дзынь-дзілінь! Наведвальнік! -- празвінеў званочак на дзвярах крамы, і банка белай фарбы адразу зацікаўлена вызірнула з паліцы.

Разам з восеньскім ветрам і зграйкай азяблага лісця ў краму паважна ўвайшло пузатае палатно. Перабіраючы драўлянымі ножкамі, ён накіраваўся да банкі.



-- Добры вечар, даражэнькая!
-- Добры, -- адказала банка, какетліва калыхаючы ручкай.
-- Мне здаецца, што Вам не месца ў гэтым цёмным кутку, спадарыня. Ці жадаеце Вы ўвайсці ў мастацкі свет і адправіцца ў маю майстэрню, каб стаць асновай для вялікай карціны? -- запыталася палатно.
-- Ды за каго Вы мяне прымаеце! -- нават не даслухаўшы, завішчала банка.
-- Я Вам што, грунтоўка якая танная? Мяне ж пад гэтай мазнёй ніхто не заўважыць!!!

Яна яшчэ працягвала абурацца, але дзвярны званочак ужо праспяваў «Дзынь-дзілінь!», і дубовыя дзверы зачыніліся за пакрыўджаным палатном.

Непрыкметна прыйшла зіма. Наведвальнікаў не было. Банка кожны дзень глядзела ў акно на белы снег і марыла аб славе.
-- Можа, калі-небудзь мне гэтак жа пашанцуе пафарбаваць увесь свет белым, -- думала яна.

Але з першымі вясновымі промнямі снег растаў, а банка ўсё пылілася на паліцы. Ужо набліжаўся абед, як раптам яна пачула:
-- Дзынь-дзілінь! Наведвальнік! -- і радасна падскочыла.

У краму, стукаючы сцёртай драўлянай ручкай, увайшоў дыхтоўны стары пэндзаль для дарожнай разметкі. Ён паправіў свой ускудлачаны ворс і кіўнуў банцы:

-- Здароў! Тут нядрэнная работка ёсць. Трэба б паднавіць пешаходныя пераходы. Ды і наогул на дарогах разметка пасціралася. Ты як на гэты конт?
-- Што? Я? Вось дык прапанова! Каб па мне тапталіся брудныя падэшвы і ездзілі мокрыя шыны? Каб я таксама сцерлася праз год і пра мяне ўсе забыліся? Ды ні за што!
-- Ну, справа твая.
І пэндзаль сышоў у іншую краму, пляснуўшы дзвярамі. Званочак перасцерагальна празвінеў.
-- Замоўкні ўжо! Мой зорны час яшчэ не прабіў, -- самаздаволена заявіла банка.

Неўзабаве настала лета -- пара школьных канікулаў. У дзверы нячутна праціснулася маленькая чорная памылка друку. І, заікаючыся ад збянтэжанасці, яна нясмела прапішчала, звяртаючыся да банкі:
-- Тысячу разоў прабачце, ці не будзеце Вы ласкавы падзяліцца са мной малюсенькай кропелькай вашай выдатнай белай фарбы, каб паправіць некаторыя памылкі перад новым навучальным годам.
-- Здаўся мне і твой выбачальны тон, і гэты навуковы год! -- закрычала банка. -- Я, між іншым, натура суцэльная і на дробязі не разменьваюся!
Памылка друку, пачырванеўшы, патупала да дзвярэй, і, не адкрываючы іх, паціху знікла за парогам.

Запыленая банка зноў засталася без увагі, не лічачы дзвярнога званочка. Але ненадоўга. Праз некалькі дзён у яе скончыўся тэрмін прыдатнасці, і яе месца заняла новая банка з выдатнай белай фарбай. А можа, і з іншым характарам.



*Кастусь Міхалевіч*
*Казачка*

Даўно ў адным валадарстве жылі самыя годныя людзі, рупліўцы, да ўсяго спраўныя, таленавітыя. Гаспадарыў у іх Пан Кароль са сваёй разумнай, але зачэпістай жонкай Пані Каралевай, і была ў іх дачка, каралеўна Чысцютка.

Шмат доўгіх гадоў запар валадарства дыхала роўна, ніякага гора не ведала. Маленькая Чысцютка з цягам часу сталела і прываблівала пякучай прыгажосцю ды тонкімі паводзінамі процьму залётнікаў з блізкіх і дальніх земляў. Але сэрца яе заставалася халодным да кожнага з іх. Цёплымі днямі каралеўна бавілася вясёлымі вандроўкамі па размаітых мясцінах валадарства. Неўзабаве надышлі халады, і каралеўнай запанавала цяжкая, як галоўная вежа сталіцы, і глыбокая, як бацькава скарбніца, самота..

Бацька Кароль з болем глядзеў на засмучаную дачку, колішняя весялосць часам лунала ў ейных вачах, хіба толькі калі з паўднёвых земляў прывозілі яскравыя кветачкі… Кароль пайшоў раіцца да жонкі. Узгадалі сваю ясную маладосць, сваё вяселле, калі з месяц салодка ела і піло ці не ўсё валадарства, калі, здавалася, і Месяцу шкада было змяншацца, бо было цікава паглядзець на гэтыя забавы. Дый надумаў тады бацька: прыйшоў час ажаніць дачку (і сябе тым пацешыць). Але жаніхоў было шмат, так проста не абярэш… Пагаманілі яны з гэтай важнай прычыны, але безвынікова. Адно толькі вырашылі, што калі дачка ў гэтым шлюбе шчаслівая не будзе, дык які сэнс ад усяго гэтага мерапрыемства?

Вось і запыталі ў яе, чаго яна болей за ўсё прагне, чаго ейнаму дзявочаму сэрцу не хапае. На хвілінку тварык Чысцюткі асветліўся, як раней бывала. Адно слова мовіла яна ў адказ: “Сонейка”.
Бацька Кароль быў сапраўдны мужчына і зразумеў усё канкрэтна – праз які дзень гарластыя вястуны валадарства абвяшчалі на ўсю краіну навін… у сталіцы сам Кароль з сям’ёй прымаюць у госці лепшых дзяцюкоў, якія жадаюць узяць за жонку каралеўскую дачку. Кожны ахвотны мусіць прынесці з сабой сваё сонейка.



Шмат хто падзівіўся з гэткага патрабавання, але неўзабаве пацягнуліся да брамы палаца першыя госці. Самым першым прыйшоў каралевіч з суседняга валадарства Бядун. Бадзёра ўвайшоў ён у каралеўскі пакой, павітаўся і нахабным рухам выцягнуў з-пад пахі залатую манету.
“Гэта, - кажа ён, - маё сонейка, нават, уначы са мной, грэе ў самы люты мароз! Няма роўнага майму багаццю. Хадзі, каралеўна, за мяне: мой двор багацейшы ў свеце.” Ці варта казаць, што Чысцютка перадусім страшна спалохалася, не хацелася ёй стаць чарговай каштоўнасцю у найбагацейшым доме свету. Адмовіла яна гэтаму жаніху. Бядун быў жудасна абражаны – ніводная жанчына раней не смела яму адмаўляць.
Ён знік, сям’я з палёгкай выдыхнула. Тут прыйшоў другі госць.



Гэта быў Рыцар у прыгожых моцных латах, зараз яны былі з драпінамі і вышчарбленыя – гэта было знакам ягонай неўтаймоўнай мужнасці. Ён зайшоў у пакой і з грукатам апусціў цяжкі шчыт на падлогу (кажуць, дагэтуль можна знайсці след ад яго). Зняўшы перад каралеўскімі асобамі шлем, ён, апусціўшы галаў, пачаў прамаўляць: “Бачыш, каралеўна, герб на маім шчыце? Бачыш выяву ўвішнага срэбранага вершніка, што высока, годна ўзняў свой меч? Знак на ягоным шчыце – маё сонейка. Мае продкі верылі: гэты вершнік штораніцы перамагае цемру і скача ўдзень па небе.
Я гатовы памерці за яго, каралеўна”. Ён казаў роўна, спакойна, як самы сапраўдны рыцар. Адно гэтае падбухторвала Чысцютку даць згоду адразу. Ягоная прамова яшчэ болей пацвердзіла ейнае жаданне. Яна гарэзліва запатрабавала: “Пакінь мне сваё сонейка!” Рыцар з жалем адказаў “Даруй, ясная панічна Чысцютка, але я не магу. Калі я аддам табе яго, я ўжо не буду тым, кім ёсць зараз, а без гэтага маё існаванне не мае сэнсу”. Каралеўна ў адказ ганарліва адмовіла, і рыцар, засмучаны, накіраваўся дахаты.
Потым быў шэраг малацікавых гасцей, пераважна людзі цягнулі розныя выявы сонейка. Ад гэтага каралеўна засумавала яшчэ болей. Яна ў думках пачала вяртацца да вобраза мужнага Рыцара, якога незнарок пакрыўдзіла, і аднаго дня запытала бацьку аб ім. Твар бацькі не быў бесклапотны, як

звычайна. Аказалася, што Бядун, не стрываўшы крыўды, сабраў вялікае войска і рушыў з вайной на валадарства. Рыцар і шмат  іншых мужных ахоўнікаў спакою валадарства сталі перад навалай чужынцаў. Рыцар стаяў мурам, бо стаяў яшчэ і за знак сонейка. Людзі валадарства біліліся ўдала, іхнія страты былі невялікія, але ж Рыцар абраў самае гарачае месца і шалёна націснуў туды з усёй сваёй дружынай… У лютай сечы абодва няўдалых жаніха знайшлі сабе вечны прытулак.

Аб гэтым каралеўне распавёў гаспадар невялічкага фальварка, блізу якога адбылася страшная бітва. Вядома, ён сам удзельнічаў у гэтым пекле і казаў,  што зараз ён, як ніколі, любіць жыццё, адзінае, салодкае, кароткае, яскравае, часам дурное, але ж ягонае! Да каралеўны ён прыйшоў не проста як сведка тае бітвы. І ён прынёс ёй сваё сонейка. Гаспадар выцягнуў вялікі прыгожы яблык, працягнуў каралеўне і мовіў: “Ясная каралеўна! Здаўна наш садок лічыўся неўрадлівым. Але за даглядам майго дзеда, а потым бацькі ўсё перамянілася: да самай позняй восені наш садок дае шанец людзям усіх станаў паласавацца найсаладзейшымі ў валадарстве яблыкамі. Наш садок некалькі год запар прагна паглынаў сонечныя прамяні, таму я ўпэўнены, зараз гэтыя прамяні тут, у гэтым пакоі. Пакаштуй, каралеўна, будзь ласкавая!” І яна пакаштавала… Такой шчаслівай яна  не  была ніколі. Яна адчувала самы салодкі смак ва ўсім валадарстве, ва ўсім сусвеце (дзеля справядлівасці зазначым,  што яшчэ саладзейшы смак адчуў потым гаспадар, калі госцікі гукалі “Горка!”, -- смак вуснаў панічны Чысцюткі).

Міналі  шчаслівыя дзянькі, месяцы, памёр стары Кароль. Узвысіўся гаспадар, каралеўна стала Каралевай. Але след мужнага Рыцара не знік марна. Яна да скону дзён памятала ягоную  прамову і пасля недоўгай рады з мужам, яны ўзялі герб са знакам сонейка, герб Рыцара за герб усяго валадарства…

Прысвячаецца Кацярыне Ш.



Раманава Анастасія
Жыла- была Рэчка

Жыла-была рэчка. Спачатку яна была вясёлым маленькім ручайком. Які хаваўся сярод высокіх стройных елак і беластволых бяроз. І ўсе гаварылі: “Якая смачная, якая чыстая вада ў гэтым ручайку!Потым ручэй ператварыўся ў сапраўдную рэчку. Вада ў ёй цякла ўжо не так хутка, але была празрыстай і чыстай.

Рэчка вельмі любіла падарожнічаць. Аднойчы яна апынулась ў горадзе. Тут не раслі елкі і бярозы, затое стаялі вялікія дамы. У якіх жылі людзі. Шмат людзей. Узрадаваліс жыхары і запрасілі застацца рэчку ў іх. Згадзілася рэчка, і яе закавалі каменнымі берагамі. Па ёй сталі хадзіць параходы і лодкі, на берагах загараць людзі.

Рэчка паіла ўвесь горад.Ішлі гады. Людзі прывыклі да Рэчкі і больш ні аб чым яе не прасілі, а рабілі ўсе тое, што на розум прыйдзе. Аднойчы на яе берагах пабудавалі вялікі завод, з комінаў якога ў Рэчку пацяклі брудныя струмені. Пацямнела Рэчка ад смутку, стала бруднай і мутнай..

Ніхто больш не гаварыў: “ Якая чыстая і прыгожая рэчка!” Ніхто больш не гуляў на яе берагах. У ёй мылі машыны, бялізну. І ніхто з гарадскіх жыхароў не задумаўся, што рэчка таксама жывая.

А яна вельмі турбавалася.”Чаму людзі дрэнна да мяне адносяцца? Я іх паіла, круціла турбіны электрастанцый, давала святло, абараняла ў жаркія дні ад спёкі?” – думала яна.

Ішоў час. Людз ўсё больш забруджвалі Рэчку, а яна ўсё цярпела, чакала, калі ўсяму гэтаму прыйдзе канец.Аднойчы па рэчцы праплыў вялікі танкер, з якога ў ваду вылілась шмат нафты.Пакрылась Рэчка цёмнай плеўкай., сталі яе жыхары – расліны і жывёлы – задыхацца без паветра.

Зусім захварэла Рэчка.

“Не, - думае, - Нельга больш заставацца з людзьмі. Трэба уцякаць ад іх, бо я стану мёртвай рэчкай.”. Паклікала яна на дапамогу сваіх жыхароў. “ Я заўсёды для вас была роднай хатай, а зараз прыйшла бяда, нашу хату разбурылі людзі, а я захварэла. Дапамажыце мне стаць здаровай, і мы пойдзем адсюль у другія краіны, дзе няма няўдзячных людзей.

Сабраліcь рачныя жыхары - і расліны, і рыбы, і слімакі, і звяры, - прыбралі ў сваёй хаце бруд, вылечылі Рэчку. І пабегла яна ў край свайго дзяцінства. Туды, дзе раслі елкі і бярозы, дзе чалавек - рэдкі госць. А жыхары горада на наступны дзень заўважылі, што засталіся адны, без Рэчкі .Прапала ў кватэрах святло, спынілі рух заводы, не стала вада ў кранах. Няма чым памыцца,няма чага напіцца, няма з чаго зварыць ежу. Спынілась жыццё ў горадзе. Сталі яго жыхары настолькі бруднымі, што перасталі пазнаваць адзін аднаго. Аднак, гэта не самае галоўнае, бо вечарам усё роўна не было святла.

І вось прыйшоў той час, калі гарадскія жыхары з'елі ўсе свае прыпасы ежы.Тады самы стары і мудры Жыхар сказаў: "Паважаныя спадары! Я ведаю, чаму ад нас пайшла Рэчка. Калі я быў зусім маленькі, я купаўся ў яе чыстай вадзе. Яна заўсёды была нам сяброўкай і памочніцай. А мы не цанілі гэтага і адносіліся да яе дрэнна. Мы несправядліва пакрыўдзілі Рэчку і павінны папрасіць прабачэння ў яе. Я прапаноўваю, адправіцца па далёкіх краінах на паклон нашай карміцельцы. Вы павінны папрасіць прабачэння ў яе і паабяцаць сваё сяброўства. Магчыма, толькі тады яна вернецца".

Адправіліся самыя моцныя і вынослівыя гараджане шукаць Рэчку.Доўга шукалі і знайшлі, але не адразу даведаліся., што яна стала чыстай і празрыстай.Папрасілі людзі Рэчку хутчэй вярнуцца ў горад , расказалі, як ім дрэнна без яе і прапанавалі свой клопат. Рэчка была добрай і не памятала лютасці. А тым часам яна вельмі стала сумаваць без людзей, да якіх за доўгія гады прывыкла ў горадзе.

Вярнулася Рэчка ў горад дапамагаць яго жыхарам. А людзі прыбралі ўсё смецце, вычысцілі сцекі завода, нават вылучылі спецыяльных вучоных сачыць за здароўем і самаадчуваннем Рэчкі.

З таго часу ў гэтым горадзе людзі і Рэчка жывуць у згодзе. А з нядаўняга часу Рэчку зрабілі пачэснай грамадзянкай горада, а Дзень яе вяртання азначаюць як самае галоўнае свята.

*Ігар Кузьмініч*
*Пра яйка і пра тое, як з яго нарадзілася жыццё*

Некалі на нашай планеце Зямля не было нічога акрамя пяску ды камення. Не было вады, а значыць не было ніякага жыцця тут.

І жыў на нашай планеце толькі Крук. Сумна было Круку аднаму і няўтульна.
Але аднаго разу знайшоў Крук яйка. Абрадаваўся Крук, што з яйка вылупіцца нейкая птушка і стане яму сябрам; і давай гэтае яйка даглядаць: то так яйка пад сонца падставіць, то іншым бокам паверне. У халодныя ночы нават сам Крук сядаў на яйка, каб хоць тое не змерзла.

Год праходзіць, за ім другі і трэці, ужо часу мінула процьма, а яйка і не варушыцца. Ужо што толькі Крук не рабіў: і драпаў яйка сваім чорным крылом, і ўслухоўваўся, ці хто там не варушыцца, і нават трэс яго, а яно ляжыць сабе лежма і ані-ні.

Раззлаваўся тады Крук і сам сабе думае:
- Няўжо я не знайду ўправу на гэтае яйка? Няма мне сябра з таго яйка, то хоць разаб'ю яго ды пад'ем.
Узяў Крук яйка ды паляцеў у самае гарачае месца на Зямлі. Прыляцеў, паклаў яйка на разагрэтае на сонцы каменне ды думае:
- Зараз яйка нагрэецца і лопне, а я яго згатаваным з'ем.
Ляжала тое яйка, ляжала – і нічога. Не трэснула яно ад пякельнай гарачыні.
Тады вырашыў Крук занесці яйка ў самае халоднае месца. Падумаў сам сабе:
- Змерзне і лопне.
Так і зрабіў, але яйку а нічагусенькі.



Тады вырашыў Крук занесці яйка на самую высокую гару. Была гэтая гара такая высокая, што
Крук насілу даляцеў да яе вяршыні. Заляцеў, значыцццa, Крук і адразу з самай вышыні кінуў яйка ўніз на каменне.

Бразнулася яйка аб зямлю, і хоць бы маленечкая драпінка ўтварылася. Глядзіць Крук: ну нічога не сталася яйку.



Моцна раззлаваўся Крук:
- Няўжо я гэтае яйка не знішчу?
І пачаў цягаць яго па ўсім свеце: то на поўнач, то на поўдзень, то на захад, то на ўсход. Усе староны абляцеў. Цягае тое яйка, а яно сабе цалёханькае.

Нарэшце змарыўся Крук. А гэта акурат адбылося тады, як пралятаў над нашай Беларуссю. Змарыўся і думае сабе:
- Сяду, адпачну, а там далей палячу.

Так і зрабіў. Але толькі Крук сеў на зямлю і паклаў на яе яйка, як у той жа час яйка само раскалолася, і пачала з яго біць гаючая крыніца. Упадабала, значыцца, яйка нашую зямельку, бо лепшай для жыцця не было ў цэлым свеце.

Яйка было не надта вялікае, але вады было даволі і нават болей. Прасякла ўся нашая зямелька вадою. І пачала вада разлівацца ў розныя старонкі. Так, маленечкія ручаінкі пабеглі на поўнач і на поўдзень, на захад і на ўсход, усюды жывую ваду несучы ды жыццё нараджаючы.

Такім чынам паўсталі нашыя беларускія рэкі: Дняпро, Дзвіна, Нёман, Буг, Прыпяць і шмат-шмат іншых. І разліліся гэтыя рэкі ў тыя часы шырока і неслі шмат, шмат і яшчэ крышачку вады ва ўсе бакі свету.

Вады выцякала ў вялікай колькасці. Вада запаўняла ўсе лагчынкі і нізінкі, якія толькі былі. Так паўсталі моры і акіяны, а крыніца ўсё біла і біла.

Спалохаўся тады Крук, што ўсю сушу залье тая крынічка, ды давай яе закопваць. І нанёс ён да нас тады шмат жоўтага пясочку, каб толькі ўтаймаваць крынічку. Так ён увіхаўся, што засыпаў нарэшце гаючую

крынічку з жывой вадой, ад чаго нашыя рэкі сталі меншымі, ды ўрэшце суша параўнялася з вадой.

Аднак не спынілася біць крынічка. Да гэтага часу б’е яна. Вось толькі дзе дакладна, ніхто дазнацца не можа. Але цячэ яе вадзічка пад зямлёй, рэкі ды азёры ўсяго свету напаўняючы.

Шмат хто хацеў знайсці тую гаючую крыніцу, бо хто знойдзе будзе ўладаром усяго свету. Але добра схаваная яна ў нас. Так тая крыніца з жывою вадой схавана, што ніхто адшукаць яе яшчэ не здолеў, хоць шмат казак пра жывую ваду па свеце ходзіць.

Вада нашая – асноўнае багацце, бо яна жыццё ўсяму ў свеце прыносіць. Так у нас і ёсць – дзе ні капні – крынічку знойдзеш і гаючай вады нап’ешся. Дзякуючы Круку вады і пясочку на Беларусі даволі.

З таго часу, як лопнула яйка, ваду свету падараваўшы, і пачалося жыццё на Зямлі. З таго часу Беларусь – гэта пуп Зямлі, яе цэнтр, а для беларусаў – цэнтр жыцця.



*Тарбоўская Алеся*
*Як сяброўства шкодную звычку перамагло*

Жыў-быў хлопец Мікола і быў у яго лепшы сябар Вася. Сапраўдны скарб быў гэты сябар. Яны з Міколай  былі знаёмы змалку: хадзілі разам у школу, у кіно, на рыбалку. Вучыліся добра, нават выдатна, і ў школе, і дома было ўсё ў іх ладна! Заўсёды  разам былі, нібы два караблі побач плылі. Вася  сябру дапамагаў, Мікола таксама ўбаку не стаяў.

Але аднойчы ў вёску, дзе яны жылі, прыехалі два хлопцы, гарадскімі яны, мабыць, былі. Неяк Мікола пабачыў, што кураць яны,  і кажа  Васілю:
- Давай паспрабуем і мы!
- Мікола, ты чаго? Здурнеў ці што? Курэнне – гэта ж зло!
- Не, Вася, а можа, паспрабаваць? У мяне ёсць жаданне хутчэй дарослым стаць…
- Ну калі так жадаеш, што адказаць? Тады  не са мною, а з тымі дзвума сяброўства ідзі ладзь!
Так і пасварыліся яны. Цэлае лета не размаўлялі. Вася ўвесь час працаваў, бацькам дапамагаў, а Мікола з новымі сябрамі на рэчцы гуляў. Вася займаўся спортам, а Мікола тым часам з сябрамі курыў.

Так тыдзень за тыднем ішоў, раптам і верасень надышоў.
Вось першага верасня ўвайшлі яны ў свой клас, а там сядзіць за партай прыгажуня, і завуць яе Наташа. Ні ў кога з дзяўчат не было прыгажэйшых, чым у гэтай Наташы, блакітных вачэй.

Пачаліся заняткі, з’явіліся першыя адзнакі - у Васі  адны “дзясяткі”, а ў Міколы – “два”-“тры”!       Пагуляць той вельмі любіў, і дома нічога ён не рабіў, а Вася тым часам усё як патрэбна вучыў.

Ужо не мог Міколка на  фізкультуры бегаць: прабяжыць сто метраў  і пяць хвілін адпачывае.
Аднойчы Мікола Наташу спытаў:
-Ці будзеш са мной сябраваць?

Яна адказала:
-Ты курыш, лянуешся - як сябраваць? Няма тут чаго і казаць!
Гэту размову Вася пачуў, моцна яго дыялог закрануў.

Аднойчы Мікола ішоў да дому апусціўшы галаву, каля плота яго сустракае Вася і кажа:
- Хочаш, дапамагу табе!
- Як ты дапаможаш? Лепей я закуру!
- Не спяшайся, Мікола, ты чуў пра цудадзейную ваду?
- Не, не чуў! А што гэта?
-Дапамагае падабацца чалавеку, якога пажадаеш, вось як!
Міколку раптам нібы ад току затрасло:
- Дзе гэты цуд, мне патрэбен ён!
- Ёсць у мяне шклянка адна, але не заўсёды дапамагае яна…
- Так, зразумеў, што патрэбна рабіць?
- Для пачатку кінуць курыць!
- Добра, ўсё, я больш не куру! Вася, родненькі, нясі хутчэй гэту ваду!..



Вася наліў кубак вады і кажа:
- На, пі і болей ніколі не куры!
Міколка выпіў усю ваду да дна, калі і засталася, дык усяго кропля адна. Пытаецца ў Васі:
- Ці гэта ўжо ўсё?
-Не, яшчэ шмат патрэбна чаго! Трэба пачаць урокі вучыць, настаўнікаў слухаць і дома працу рабіць!

Тыдзень праходзіць, месяц, другі… – у Міколы ў дзённіку “дзясяткі” адны. Зноў пачаў бегаць, ажно не дагнаць, зноў з Васілём пачаў сябраваць! Вось апошні кубак вады Мікола дапіў і зноў з запытаннем да Наташы схадзіў. Тая і гаворыць:
- Давай сябраваць, ты – хлопец харошы, такіх яшчэ пашукаць!

Міколка бяжыць да Васі  і танчыць на хаду:
- Сябар мой лепшы! Дзе ты ўзяў такую ваду?
- З твайго калодзежу і ў шклянку наліў!
- Як так? Я ж яе заўсёды піў?! Так што, не цудадзейная яна? Як тады мне яна дапамагла?!
- Няма нічога ў гэтай вадзе, а вось сапраўдны сябар не пакіне другога ніколі ў бядзе!

Пасля гэтага выпадку ў іх жыцці ўсё  як па маслу пайшло, сяброўства стала яшчэ мацнейшым, чым было! Дык вось што ў гэтай казцы я хачу сказаць: не патрэбна курыць, патрэбна курэнне кідаць, а сяброў трэба шанаваць!



Таццяна Дзям'янава
Ад крадзенага не пасыцееш

Было калісь два сына ў чалавека.
Яны ў пяшчоце бацькавай  раслі
Не тое, каб зусім ужо няўмекі,
Але ні ў чым майстрамі не былі.



Гады над імі птушкамі ляцелі -
За летам - восень, зімушка, вясна…
Мальцы нябачна неяк пасталелі…
І вось аднойчы бацька ім сказаў:

-Пара і за работу, хлопцы, брацца.
Каб на жыццё чым-небудзь зарабляць.
Якою справай марыце займацца?
Ў адказ – маўчанне…  Што каму абраць?



-Дык пойдзем, – кажа бацька, – з вамі ў людзі,
Пабачым, чым займаюцца яны -
Мо нешта вам з таго цікава будзе…
Сабраўся… Наўздагон - яго сыны.

Дайшлі да вёсцы… У кузне старажытнай
У рукі молат сын старэўшы ўзяў…
А быў ён гэткі сметлівы і спрытны -
Любую справу хутка пераймаў.

Прыгледзіўся да працы кавалёвай
Стаў побач, павучыўся,  дапамог…
-Вось, бацька, і каваль табе гатовы -
І паказаў ім зроблены нарог.

-Ты  добрую абраў сабе, сын, справу.
Бо хто патрэбны людзям, той – з рублём.



Жыць працай  - і карысна і цікава -
Збудуем кузню -  станеш кавалём.
 А меншы сын, ніяк па свайму сэрцу,
Не мог занятак добры адшукаць.
А тут глядзіць – на лузе вол пасецца
І побач з ім  нікога не відаць.

-А што, калі пачаць валоў мне красці?
Не цяжка,  многа мяса – я б таўстеў…
-Крадзі, - прамовіў  бацька, - як удасцца,
Раз ты нічога болей не схацеў .

І сын пагнаў вала сабе дадому…
А бацька ззаду: ”Сынку, пачакай!
Мне трэба ў вёску гэтую… Знаёмы
Тут мой жыве… Мне часу трохі дай…”

Сын гоніць - і, бы ліст які, трасецца,
Са страхам азіраецца, бы воўк -
Ці не бяжыць за ім, ці не крадзецца
Той гаспадар, каму належыць вол?

На ўзлеску пачакаў вяртання бацькі,
З ім разам прывялі дамоў вала.
Зарэзалі і шкуру знялі… Ў хаце
Запахла свежанінай ад стала.

-Ну, сыне, знімем меркі і праверым,
Хто болей пасыцее ад мясца.
І бацька ўзяў шнурок і лоўка змерыў
Акружнасць шый – сваёй  і малайца.

Вячэраць селі – бацька есць спакойна,
Хлапчына ж паглядае ўсё ў акно:
Шукае хто ці не? Ці не запомніў?
Ці не пільнуе побач, за сцяной?

Сабака брэша, йдзе ці едзе нехта –
Сын – за кавалак мяса – і ў куток.
Здаецца, ад сябе самога збег бы –
Дрыжыць, ажно не чуе рук і ног.

Так дзень за днём… Нарэшце, з’елі мяса -
І кажа бацька: “Ну, сынок, пара
Нам таўшчынёю шыі параўнацца…”
І ўзяў у рукі кончыкі шнура.

Памералі – зірнулі: патаўсцела
У бацькі шыя болей, чым ўдвая.
У сына ж патанчэла … нават цела
Схудзела – стаў памерам з вераб’я.

Сын дзівіцца: “Чаму так? Елі ж разам!”
“Бо ты, сыночак, з крадзенага жыў!”
“Але ж і ты… валоў’е трэскаў мяса…”

“Але пайшоў спачатку, заплаціў!

Таму і пасыцеў, як ад свайго я.
А ты сгарэў, бо страх цябе душыў:
Як сядзеш есці - ён паўзе змяёю –
На шыю – скок – і гадам на душы…



Праз гэта ты, сыночак, і худзееш
І ежа на карысць не йдзе табе.
Ад крадзенага, брат, не пасыцееш!
Шукай жа лепей працу для сябе!”

Верш напісаны па існуючай у прозе казцы “Ад крадзенага не пасыцееш”.

Кацярына Пракапенка
Як кот хмары з неба змыў.

На лясным узлеску стаяў дом. Ён быў ладны і вельмі прыгожы. Навокал усё квітнела. Гэты дом належыў лесніку. Усе жывёлы, якія ведалі працавітага і добразычлівага старога, любілі і паважалі яго. Адзін толькі лянівы кот абыякавы быў да ласкі гаспадара. У гэты цудоўны дзень ён марудна крочыў да міскі, якую клапатліва прынёс гаспадар. Кот наеўся і зараз жа разваліўся на маладой траўцы. Сонца прыпякала мяккі жывот, і кот пачаў млява заплюшчваць зялёныя вочы. Яму сніўся вялізарны кавалак мяса, каторы як звычайна ляжаў у яго місцы. Ён е яго еў, еў і еў пакуль сон не скончыўся. Кот нечакана прачнуўся ад кропля дажджу. Вада хутка пранікала пад яго поўсць , прымушаючы з кожнай кропляй уздрыгваць усім целам. Лянівы звер раздражнёна пабег пад паветку.

"Гадкі дождж, - думаў кот, назірая за ліўнем. - Перашкодзіў даглядзець мой смачны сон дык яшчэ і сонца з'еў !"
-Вось зараз як змыю ўсе хмары з неба, і знікнеш ты назусім! - Пагрозліва сказаў кот і накіраваўся да самага высокага згорку ў лесе.

Ідзе кот па сцяжынцы і раптам бычыць бабра, які старана нясе дубчыкі да рэчкі.
-Вітаю цябе, бабёр. - Пакланіўся кот.
-Добры дзень. - Ветліва адказаў той, паклаўшы вязанку галінак на траву.
-Ты вельмі працавіты звер. Заўсёды носіш гэтыя дубчыкі да ракі, будуеш нешта. Не стаміўся яшчэ? - Запытаўся кот.
-Праца - гэта маё жыццё. Я будую хату, каб мая сям'я жыла ў цяпле.
Таксама я раблю плот. Гэта патрэбна маёй вёсцы. Праца, якой я займаюся ні кроплі не цяжкая. Мне вельмі прыемна яе выконваць. - Адказаў бабёр.

Кот моўчкі паглядзеў на свайго субяседніка, памеркаваў трошкі вымавіў:
-Табе праца здаецца нецяжкай справай, дык дамажы мне: ссячы дзесяць самых дужых і высокіх дрэў.



-Гэта ж лесу шкода! Навошта табе столькі? - Абурыўся бабёр.
-Дзеля важнай справы. Трэбы збудаваць вяліза-а-арную лесвіцу. - Развёў лапамі кот.
-Не, прабачай мяне, добры сусед, але я не магу ўчыніць такое з лесам. Неразумна абкрадваць свой жа дом! Веру, што справа ў цябе сапраўды важная, таму дапамагу табе. - Развaжаў працавіты звер. А потым дадаў, працягваючы вязанку тоўстых галінак: - Вось, быры, калі  ласка. Гэта матэрыял, з якога ты зможаш пабудаваць сваю лесвіцу. А калі не хопіць - ідзі да старога дуба і пазбірай на траўцы яшчэ галінак.

Кот падзякваў бабра і пайшоў далей. Па дарозе ён разважаў: “Бабёр столькі працуе і яму ўсё лёгка! Значыць мне збудаваць лесвіцу будзе яшчэ прасцей. Гэтых галінак хопіць!”



Нарэшце кот дайшо  да таго ўзгорка і , стаміў шыся, кінуў вязанку на траву. А сам, стомлены дарогай, лёг спаць, не зважаючы на дождж. Снілася яму, нібы ён дзень і ноч працуе. Будуе-будуе гэтую лесвицу, а яна ўсё не дастае да неба.

Да раніцы праспаў кот. А калі прачнуўся, здалося яму, нібы ўсё гэта было сапраўды: і цяжкая праца, і бяссонныя ночы. Паглядзеў кот на неба - а яно чыстае,і блакітнае! Ні якай хмаркі! Ласкавае сонейка ветліва запрашае ўвесь свет да новага дня!
-Вось бачыш! Змыў -так  хмары!   I знік ты! Будзеш ведаць як перашкаджаць майму сну! - Задаволена дражніў  кот дождж, якога ўжо даўно не было на небе.

Лянівы звер пацёр лапы і марудна, перавальваючыся з адной лапы на другую, пакрочыў дахаты.
А вязанка галінак так і засталася ляжаць на траве





# Змест

*Ганчарова Кацярына Казка пра дзяўчынку-зорачку* ________________3

*Ганчарова Кацярына*
*Казка пра феечку Кукаляку і яе чароўнае пёрка* ____________________6

*Даша Найба Соль* __________________________________________9

*Саша Песенка Казка*_________________________________________11

*Чатыры чаўны Віталь Воранаў*_________________________________14

*Мікола Дзятчэня*
*Аповяд пра Добрага Вожыка, які хацеў стаць злым* _______________19

*Дар'я Вашкевіч Леў і Васіліна* _________________________________22

*Сяргей Балахонаў*
*Як лісічка да хворай сястрычкі бегала* ___________________________25

*Палінка Торбачка Жалудок*____________________________________27

*Віталь Быль Піраты* ____________________29

*Таберка Кацярына Казка пра белую фарбу* ____________________30

*Кастусь Міхалевіч Казачка* ____________________32

Раманава Анастасія Жыла- была Рэчка ____________________35

*Ігар Кузьмініч*
*Пра яйка і пра тое, як з яго нарадзілася жыццё* ____________________37

*Тарбоўская Алеся*
*Як сяброўства шкодную звычку перамагло*____________________40

Таццяна Дзям'янава Ад крадзенага не пасыцееш____________________42

Кацярына Пракапенка Як кот хмары з неба змыў ____________________47